# 2023 г. – 55 гадоў з часу стварэння КОБРЫНСКАГА ПТВ № 102 будаўнікоў (УА «Кобрынскі дзяржаўны політэхнічны каледж»; 1968)

Установа адукацыі «Кобрынскі дзяржаўны політэхнічны каледж» мае багатую гісторыю. Навучальная ўстанова неаднаразова рэарганізоўвалася і мяняла назвы, але ўвесь час была накіравана на падрыхтоўку спецыялістаў для будаўнічай галіны краіны і рэгіёна.



Кобрынскае прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 102 будаўнікоў было створана ў кастрычніку 1968 года на базе трэста «Брэстсельбуд». Размясцілася ПТВ № 102 у інтэрнаце былога ПМК-70 на плошчы Леніна. Першы набор склаў усяго 88 чалавек. Навучанне праводзілася па простых будаўнічых спецыяльнасцях: маляр, муляр, тынкоўшчык, цясляр. Першы выпуск навучэнцаў адбыўся ў снежні 1969 года.

Легендарнай славай абвеяны ўспаміны з далёкіх 70-х, калі поўныя энтузіязму педагогі і навучэнцы сваімі сіламі будавалі навучальныя карпусы і «прабівалі» фінансаванне на будаўніцтва новага комплексу па вуліцы Дзяржынскага. У перыяд з 1972 года па 1982 год былі пабудаваны вытворчыя майстэрні, спартыўная і актавая залы, афармлены кабінеты і інтэрнат. Новае развіццё вучылішча атрымала з пераездам у 1982 годзе ў навучальна-вытворчы корпус па вул. Дзяржынскага, 54. У старых карпусах размясцілася тэхнічнае вучылішча №156 народных мастацкіх промыслаў.

Набор навучэнцаў павялічыўся да 220 чалавек за год. З'явілася магчымасць рыхтаваць навучэнцаў па больш складаных будаўнічых спецыяльнасцях з атрыманнем сярэдняй адукацыі. У студзені 1985 года ўведзены ў эксплуатацыю новы інтэрнат на 395 месц. 20 красавіка 1985 года пастановай калегіі Дзяржкамітэта БССР па прафтэхадукацыі ўстанове прысвоена званне «Вучылішча высокай культуры».». У 1991 годзе вучылішча ўзнагароджана пераходным Чырвоным Сцягам Дзяржаўнага камітэта БССР па прафесійна-тэхнічнай адукацыі Рэспублікі Беларусь.

29 ліпеня 1997 года вучылішча перайменавана ў вышэйшае прафесійна-тэхнічнае вучылішча будаўнікоў, і навучанне стала шматузроўневым У 2003 годзе

перайменавана ва УА «Кобрынскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж будаўнікоў».

На падставе рашэння галоўнага ўпраўлення па адукацыі Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта ад 19 жніўня 2013 года № 577 зменена найменне ўстановы адукацыі на Кобрынскі дзяржаўны політэхнічны каледж. У сакавіку 2014 года ў склад новай навучальнай установы ўвайшоў Кобрынскі дзяржаўны мастацкі прафесійна-тэхнічны каледж ў якасці аддзялення мастацкіх рамёстваў і дрэваапрацоўкі (рашэнне галоўнага ўпраўлення па адукацыі Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта № 827 ад 27.11.2013 г.). Той каледж, які мы ведаем яго сёння, утварыўся ў выніку зліцця дзвюх устаноў прафтэхадукацыі.

Сёння 667 навучэнцаў навучаюцца на ўзроўнях, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай адукацыі - 440 і сярэдняй спецыяльнай адукацыі - 227, 250 - выпускаецца штогод. Падрыхтоўка навучэнцаў ідзе па 19 спецыяльнасцях - як на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай, так і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Навучэнцы і педагогі каледжа паказваюць высокую прафесіянальную падрыхтоўку, займаючы прызавыя месцы на алімпіядах, спаборніцтвах, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах прафесіянальнага майстэрства, мастацкай самадзейнай творчасці. Сярод навучэнцаў каледжа ёсць лаўрэаты прэміі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. Работы вучняў штогод экспануюцца на фестывалі дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Беларускі вянок», рэспубліканскай выставе-кірмашы «Горад майстроў» і іншых прэстыжных фестывалях і выставах не толькі ў Беларусі, але і за мяжой.

Каледж гучыць у рэспубліцы як інавацыйная пляцоўка, гатовая да апрабацыі і ўкаранення новых праектаў і адукацыйных праграм. Высокакваліфікаваныя педагогі і майстры сваёй творчай працай забяспечылі паспяховы ход эксперыменту па стварэнні сістэмы бесперапыннай прафесійнай адукацыі, які дазваляе ў сценах каледжа атрымаць працоўную кваліфікацыю і працягнуць адукацыю на другой ступені, каб у далейшым паступіць у ВНУ. Такім правам штогод карыстаюцца каля 50 выпускнікоў першай ступені. Сярод іх заўсёды ёсць тыя, хто потым вяртаецца ў каледж у якасці майстроў і выкладчыкаў. У каледжы працуюць і

педагогі, у якіх за плячыма вялікі вопыт, і маладыя супрацоўнікі, якія вучацца на іх прыкладзе.

Ва ўстанове ёсць усе ўмовы для вучобы, працы, занятак спортам і адпачынку як навучэнцаў, так і працаўнікоў каледжа. Для тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі навучэнцаў абсталявана 23 вучэбныя кабінеты, 7 навучальных майстэрняў. Дзейнічаюць гурткі і клубы па інтарэсах, спартыўныя секцыі. Ёсць інтэрнат, бібліятэка, чытальная і спартыўная залы, дыскаклуб, музей і выставачныя залы, дзе сабраны лепшыя працы навучэнцаў, выпускнікоў і выкладчыкаў.

Асноўным паказчыкам работы ўстановы з’яўляецца працаўладкаванне яго выпускнікоў і станоўчыя водгукі аб якасці іх падрыхтоўкі. За гады існавання каледжа падрыхтавана больш за 8 тысяч кваліфікаваных спецыялістаў па будаўнічых спецыяльнасцях. У раёне няма такой арганізацыі, дзе б ні працавалі выпускнікі каледжа – бетоншчыкі, мантажнікі, электрагазазваршчыкі, маляры, тынкоўшчыкі, абліцоўшчыкі-плітачнікі, станочнікі дрэваапрацоўчых станкоў, разьбяры па дрэве і бяросце, выканаўцы мастацка-афарміцельскіх работ, абіўшчыкі мэблі, майстры па манікюры.

У гісторыю каледжа ўпісаны слаўныя імёны кіраўнікоў, дзякуючы якім установа набыла рэспубліканскую вядомасць: Пятра Лявонцьевіча Сазаненкі, першага дырэктара і заснавальніка вучылішча (лістапад 1968 - ліпень 1976); Антона Васільевіча Букача, заслужанага настаўніка Беларускай ССР (ліпень 1976 - сакавік 1982); Эдуарда Рыгоравіча Галушкі (сакавік 1982 - сакавік 1988), пад кіраўніцтвам якога ў студзені 1985 года быў уведзены ў строй новы інтэрнат па вул. Дзяржынскага, 54; Міхаіла Львовіча Гольцмана (красавік 1988 - чэрвень 2013), выдатніка прафтэхадукацыі, дзякуючы намаганням якога ўстанова атрымала статус вышэйшай; Васілія Мікалаевіча Дземідовіча (ліпень 2013- 2016), пад кіраўніцтвам якога будаўнікі і мастакі пачалі навучацца ў адной установе. З 11 кастрычніка 2016 года дырэктарам каледжа прызначаны Аляксандр Пятровіч Юшчук.

*Матэрыял падрыхтаваны ў 2023 г. Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай. Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі*

**Рысь, А. М.** Кобрынскае вышэйшае прафесійнае вучылішча будаўнікоў / А. М. Рысь // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 413.

**Установе** адукацыі «Кобрынскі дзяржаўны політэхнічны каледж» (1968) – 55 гдоў // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 104.

**Бакун, Е**. Все профессии важны / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2023. — 25 сакавіка (№ 22). — С. 9 : фот.

В учреждении образования «Кобринский государственный политехнический колледж» прошел День открытых дверей.

**Бакун, Е.** Мастер года-2023 — кобринчанка Алла Прокурат / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2023. — 29 красавіка (№ 31). — С. 9 : фот.

Мастер по специальности «Художественно-оформительские работы и дизайн интерьера» Кобринского государственного политехнического колледжа Алла Прокурат — победитель областного конкурса «Мастер года».

**Бакун, Е.** Наркотикам — твердое «нет» / Елена Бакун ; фото из архива Кобринского ГПК // Кобрынскі веснік. - 2023. — 15 лютага (№ 12). — С. 6 : фот.

В учреждении образования «Кобринский государственный политехнический колледж» проводят мероприятия по профилактике употребления и распространения наркотиков.

**Бакун, Е.** Творить благо — девиз неравнодушных / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2023. — 21 студзеня (№ 5). — С. 9 : фот.

О деятельности волонтеров отряда «#БЛАГОТВОРИ» Кобринского государственного политехнического колледжа.

**Белов, Д**. Весело и познавательно: масштабная квиз-игра прошла в Кобринском государственном политехническом колледже / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2023. — 1 красавіка (№ 24). — С. 9 : фот.

**Белов, Д.** Воспитывать героев / Дмитрий Белов ; фото: Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2023. — 22 лютага (№ 14). — С. 1, 3 : фот.

О руководителе по военно-патриотическому воспитанию Кобринского государственного политехнического колледжа Константине Меньшикове.

**Белов, Д.** Чтобы помнили: в Кобринском ГПК почтили память погибших в Афганистане / Дмитрий Белов ; фото: Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2023. — 22 лютага (№ 14). — С. 5 : фот.

**Дело** мастера боится / фото из архива конкурса // Кобрынскі веснік. - 2023. — 14 чэрвеня (№ 43). — С. 5 : фот.

На базе УО «Кобринский государственный политехнический колледж» прошел областной конкурс профессионального мастерства по профессии «Монтажник санитарно-технических систем и оборудования».

**Бакун, Е**. Молодая смена на пороге / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2022. — 6 ліпеня (№ 50). — С. 8 : фот.

В Кобринском государственном политехническом колледже и Кобринском государственном лицее сферы обслуживания состоялся выпуск молодых специалистов.

**Бакун, Е.** На уроке с Президентом / Елена Бакун ; фото из архива Федора Быха // Кобрынскі веснік. - 2022. — 7 верасня (№ 68). — С. 2 : фот

Учащийся Кобринского государственного политехнического колледжа Федор Бых принял участие в открытом уроке, который провел в Минске Президент РБ А. Лукашенко.

**Бакун, Е.** Отличники образования / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2022. — 5 кастрычніка (№ 76). — С. 5 : фот.

В числе 14 награжденных почетным нагрудным знаком «Выдатнік адукацыі» — два представителя Кобринщины.

**Белов, Д**. Соревновались мастера и мастерицы / Дмитрий Белов ; фото: Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2022. — 15 студзеня (№ 3). — С. 1 : фот.

На базе СШ № 7 г. Кобрина и Кобринского государственного политехнического колледжа состоялся III этап республиканской олимпиады по трудовому обучению.

**Грышкевіч, С**. Майстры на ўсе рукі / Сяргей Грышкевіч // Настаўніцкая газета. - 2022. — 4 студзеня (№ 1). — С. 5.

Пра фінал абласнога конкурсу майстроў вытворчага навучання «Майстар года — 2021», які прайшоў у Брэсцкім дзяржаўным каледжы сувязі і Кобрынскім дзяржаўным політэхнічным каледжы.

**Елизарова, Ж.** На пути к профессии / Жанна Елизарова ; фото: Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2022. — 22 чэрвеня (№ 46). — С. 4 : фот.

В Кобринском государственном политехническом колледже началась вступительная кампания на 2022—2023 учебный год.

**Яскевіч, С.** Рабочыя рукі робат не заменіць / Святлана Яскевіч ; фота аўтара і з архіва каледжа // Звязда. - 2022. — 5 студзеня (№ 2). — С. 6 : фат.

Аб дзейнасці Кобрынскага палітэхнічнага каледжа, дзе рыхтуюць будаўнікоў, дрэваапрацоўшчыкаў, майстроў мастацкіх рамёстваў.

**Бакун, Е.** Терпение и труд все перетрут / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2021. — 3 красавіка (№ 27). — С. 1 : фот.

На базе СШ № 7 г. Кобрина и Кобринского государственного политехнического колледжа прошел заключительный этап областной олимпиады по учебному предмету «Трудовое обучение».

**Белов, Д.** Кобринские каменщики — лучшие! / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2021. - 24 сакавіка (№ 24). - С. 6 : фот.

Учащийся Кобринского государственного политехнического колледжа В. Крусь занял первое место в областном конкурсе профессионального мастерства по профессии «Каменщик».

**Белов, Д.** Соревновались станочники / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2021. — 10 лістапада (№ 89). — С. 5 : фот.

На базе Кобринского государственного политехнического колледжа состоялся областной конкурс профессионального мастерства по профессии «станочник деревообрабатывающих станков».

**Белов, Д.** Учиться и быть востребованным / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2021. — 21 ліпеня (№ 57). — С. 5 : фот.

В Кобринском государственном политехническом колледже началась очередная вступительная кампания.

**Вовк, Ю.** Лучший каменщик области живет в Кобрине / Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2021. — 8 апреля (№ 14). — С. 3 : фот.

Учащийся Кобринского государственного политехнического колледжа В. Крусь стал победителем областного конкурса профессионального мастерства.

**Грышкевіч, С.** Вызначылі лепшых муляроў / Сяргей Грышкевіч // Настаўніцкая газета. - 2021. — 23 сакавіка (№ 32). — С. 4 : фат.

Навучэнец Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа Валянцін Крусь — пераможца абласнога конкурсу прафесійнага майстэрства навучэнцаў і майстроў вытворчага навучання па прафесіі муляра

**Грышкевіч, С.** Шкатулка і арганайзер за тры гадзіны / Сяргей Грышкевіч // Настаўніцкая газета. - 2021. — 3 красавіка (№ 37). — С. 3.

Пра заключны этап Рэспубліканскай алімпіяды па працоўным навучанні на базе СШ № 7 г. Кобрына і Кобрынскага палітэхнічнага каледжа.

**Экологический** отряд Кобринского государственного политехнического колледжа — в числе лучших / по информации Кобринского РК ОО «БРСМ» ; фото из архива Кобринского РК ОО «БРСМ» // Кобрынскі веснік. - 2021. — 18 снежня (№ 100). — С. 4 : фот.

Экологический отряд Кобринского государственного политехнического колледжа награжден грамотой республиканского конкурса «Трудовой семестр».

**Елизарова, Ж.** Здесь учатся жизни / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2020. — 24 кастрычніка (№ 83). — С. 9 : фот.

О Кобринском политехническом коледже.

**Елизарова, Ж**. Профтех — всему начало / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2019. — 4 снежня (№ 94). — С. 4 : фот.

Кобринский политехнический колледж дает отличные возможности для профессионального становления молодежи.

**Елизарова, Ж.** Симбиоз мастерства и творчества / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2018. — 24 кастрычніка. — С. 1, 2.

Кобринский политехнический колледж отмечает полувековой юбилей.

**Грышкевіч, С.** Удасканальваць падрыхтоўку кадраў ва ўмовах інавацыйнага развіцця рэгіена / Сяргей Грышкевіч // Настаўніцкая газета. - 2017. — 12 верасня. — С. 5.

«Кобрынскі дзяржаўны політэхнічны каледж» не толькі рыхтуе рабочых і спецыялістаў, але і ажыццяўляе перападрыхтоўку рабочых кадраў.

**Бакун, Е.** Когда работа и учеба в радость / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. — 4 студзеня. — С. 4.

Учащиеся Кобринского государственного политехнического колледжа - активные участники и достойные победители многих районных, областных и республиканских конкурсов.

**Курбат, Л**. Просвещение и убеждение / Лидия Курбат // Заря. - 2017. — 28 снежня. — С. 22.

Работы учащихся Д. Куриченко (Кобринский государственный политехнический колледж) и Я. Карлович (СШ № 3 г. Кобрина) получили награды областного конкурса художественного плаката и рисунка «Опасность — СПИД».

**Бурдыка, В. В**. I вучаць, і выхоўваюць / Вячаслаў Бурдыка // Народная трыбуна. - 2016. — 1 ліпеня. — С. 11

Педагагічны калектыў Кобрынскага політэхнічнага каледжа на 80 працэнтаў укамплектаваны ўласнымі выпускнікамі.

**Бялоў, Дз.** Калі ў душы жыве мастак... / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2016. — 9 красавіка. — С. 1, 3.

Жыццёвы і працоўны шлях дырэктара Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа В. Дземідовіча.

**Савчук, М.** Конкурс, как праздник профмастерства / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2016. - 2 июня. - С. 2.

Учащиеся Кобринского политехнического колледжа завоевали золотую и серебряную награды на Республиканском конкурсе профессионального мастерства «WorldSkills Belarus - 2016».

**Тимошук, А**. Точный расчёт будущих зодчих / Анна Тимошук // Кобрынскі веснік. - 2016. — 3 лютага. — С. 3.

Учащиеся Кобринского государственного политехнического колледжа стали лучшими на областной олимпиаде по строительству.

**Глущенко, Т.** Подиум для технической мысли / Тамара Глущенко // Вечерний Брест. - 2015. — 6 марта. — С. 6 : фот.

На областном смотре технического творчества политехнический колледж представил технику для испытания сантехнической арматуры.

**Дубина, Л.** Василий Демидович: «Объединение нас обогатило» / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2015. — 2 снежня. — С. 3.

Кобринский ГПТК посетили члены актива Республиканского совета директоров учреждений профессионально-технического и среднего специального образования.

**Казакова, А**. Современное образование - залог будущего успеха / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2015. — 3 декабря. — С. 4.

Кобринский ГПТК посетили члены актива Республиканского совета директоров учреждений профессионально-технического и среднего специального образования.

**Юрэвіч, К.** Праменьчык святла / Кірыл Юрэвіч // Народная трыбуна. - 2015.— 19 чэрвеня. — С. 10.

Аляксандр Півэварэвіч, навучэнец політэхнічнага каледжа, валанцёр суполкі «Адрасы добрых спраў», гітарыст, фотамайстар і вельмі светлы чалавек.

**Бялоў, Дз**. Вучоба павінна быць цікавай / Дзмітрый Бялоў ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2014.— 12сакавіка.— С. 3.

Кобрынскі дзяржаўны політэхнічны каледж – установа, аб'яднаўшая былыя каледжы – мастацкі і будаўнікоў.

**Бялоў, Дз.** Перспектыўны кіраўнік / Дзмітрый Бялоў ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2014.— 4 студзеня — С. 12.

Дэпутат Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Васіль Дземідовіч нядаўна ўзначаліў Кобрынскі політэхнічны каледж, які павінен стаць установай сярэдняй адукацыі.

**Белов, Д.** Воспитывать созидателей / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2014. — 3 снежня. — С. 3.

**Бялоў, Дз.** Вучоба павінна быць цікавай / Дзмітрый Бялоў ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2014.— 12сакавіка.— С. 3.

Кобрынскі дзяржаўны політэхнічны каледж – установа, аб'яднаўшая былыя каеджы – мастацкі і будаўнікоў.

**Казакова, А**. ПТО: вчера, сегодня, завтра / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2015. - 22 октября. - С. 2.

В Кобринском политехническом колледже отметили юбилей профтехобразования.

**Кондрашук, Н.** Мельница для молодых и талантливых / Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. - 2014. — 20 февраля. — С. 3.

Участников межрегионального фестиваля-конкурса «Мельница идей» принимал у себя политехнический колледж.

**Лесик, И.** В гармоничном единении / Ирина Лесик // Кобрынскі веснік. - 2014. — 23 декабря. — С. 3.

**Ярмошук, Н**. Пошла ли оптимизация на пользу колледжу? / Николай Ярмошук ; фото Валерия Короля // Заря. - 2014. —21 июня. — С. 3.

**Інфармкур'ер**: мясцовыя навіны // Кобрынскі веснік. - 2013. — 17 красавіка. — С. 1.

Творчыя калектывы з Кобрынскага каледжа будаўнікоў заваявалі другое месца ў абласным аглядзе-конкурсе «Арт-Віват».

**Жук, Е.** В программе - два события / Елена Жук // Вечерний Брест. - 2008. - 29 октября. - С. 3.

Под крышей колледжа строителей состоялось два события – республиканский семинар и день рождения учебного заведения.

**С днём рождения**, колледж! // Заря. - 2008. - 23 октября. - С. 17.

Государственному профессионально-техническому колледжу – 40 лет.

**Колледжу** строителей – 35 лет // Кобрин-информ. – 2003. – 23 октября. – С. 2.

**Васюк, Н.** Я б в строители пошел…// Кобрин-информ. – 2003. – 15 мая. – С. 2.

Кобринское высшее профтехучилище получило статус проф-тех. колледжа

**Высшему** училищу сттроителей – 30 лет // Кобрынскі веснік. – 1999. – 30 чэрвеня. – С. 2.

Рэгіён
Кобрынскі раён
Кобрын
Установы:
Кобрынскі політэхнічны каледж
Прадметы:
Установы адукацыі
Каледжы